# Ежы Гедройц і беларуска-польская культурная прастора

*Любоў Уладыкоўская-Канаплянік, кандыдат філалагічных навук*

Праблема беларуска-польскага культурнага ўзаемадзеяння апісана беларускімі навукоўцамі дастаткова шырока (варта ўзгадаць хаця б зборнікі матэрыялаў міжнароднай штогадовай канферэнцыі «Шлях да ўзаемнасці»), хаця часам фрагментарна, нават лакальна, без належнай сістэмнасці. З чым пагаджаюцца даследчыкі, — гэта з тым, што культурныя сувязі маюць быць больш шчыльнымі, а ўзаемная павага — больш выяўленай. Дарэчы будзе ўзгадаць, што беларусы разам з палякамі (а таксама з украінцамі і літоўцамі) перажылі сваю нацыянальную драму ў канцы XVIII ст., а потым прыблізна адначасова з палякамі адрадзілі сваю дзяржаву, праўда, з рознымі наступнымі вынікамі.

Культура вызначае і ўнутраную моц краіны, і яе аўтарытэт на міжнароднай арэне, а таксама валодае тым унікальным наборам мажлівасцей, якім не валодае ні палітыка, ні эканоміка, бо культура фарміруе светапогляд чалавека і грамадства, найдаўжэй захоўвае народныя традыцыі і нацыянальны менталітэт. Адначасна культура, як вядома, выступае і адмысловым, нястомным, глыбокім дыпламатам, асабліва на фоне сучасных працэсаў міжкультурнага дыялогу і палілогу. Менавіта праз культуру будуюцца самыя пазітыўныя дыялогі і дзеецца канструктыўнае, доўгатэрміновае супрацоўніцтва.

Каб закрануць некаторыя аспекты беларуска-польскай культурнай прасторы, лічу неабходным узгадаць феномен Ежы Гедройца. Чаму?

Выглядае, што ўвогуле ў сацыякультурных працэсах надзвычай многае залежыць ад асобы, якая, з аднаго боку, таленавіта выяўляе змест эпохі, яе асаблівасці, праблемы, агульны напрамак — як кропля вады адлюстроўвае наваколле, і, можа, першай прадчувае будучыя змены. З іншага ж боку, адораны, харызматычны, таленавіты чалавек (а менавіта такім быў Ежы Гедройц) сам у стане ўплываць на развіццё падзей, фарміраваць іх, што асабліва

актуальна ва ўмовах сучаснага глабалізму (успомнім хаця б вядомы «эфект матылька»).

Беларусь і Польшча багатыя на асобы, пры адным узгадванні імёнаў якіх становіцца відавочнай агульнасць нашай гісторыі, культуры, менталітэтаў, памкненняў, а ўрэшце — ідэалаў і інтарэсаў нашых народаў. Адна з такіх асобаў − Ежы Гедройц − прарок народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, які праз самога сябе і сваю дзейнасць выявіў матрыцу, сімвальны і змястоўны сэнс беларуска-польскага культурнага ўзаемадзеяння.

Хаця ідэі Ежы Гедройца рэалізаваныя, увасобленыя ў жыццё, сам ён застаецца культурным феноменам, які на працягу доўгага часу няспынна змяняе культурны, інтэлектуальны, сацыяльны і нават палітычны ландшафт, аказвае ўплыў на светапогляд грамадства — і польскага, і беларускага, асабліва культурнай і інтэлектуальнай эліты. Невыпадкова па прапанове Сейма Рэчы Паспалітай ад 29 ліпеня 2005 г. і пры падтрымцы ЮНЕСКА 2006 г. быў абвешчаны годам Ежы Гедройца.

Прадстаўнік старадаўняга беларуска-літоўскага шляхецкага роду, Ежы Гедройц нарадзіўся ў Мінску 27 ліпеня 1906 г. і пражыў тут 12 гадоў, затым з сям'ёй пераехаў у Варшаву. У 1946 г. заснаваў Літаратурны інстытут у Рыме, а ў 1947 г. — штомесячнік «Культура» у Парыжы (крыху пазней перабраўся ў мястэчка пад Парыжам), які нязменна рэдагаваў аж да сваёй смерці ў 2000 г. Да верасня 2000 г. выдадзена 511 тамоў Бібліятэкі Культуры, у тым ліку 132 нумары Гістарычных сшыткаў і 636 нумароў «Культуры» [1].

«Культура» сталася найважнейшым польскім інтэлектуальным асяродкам другой паловы XX ст., а сам Ежы Гедройц — сімвалам здаровага сэнсу і фундаментальнай іерархіі каштоўнасцей, у аснове якой былі і застаюцца вольнасць, талерантнасць, дыялог. Апошні грамадзянін Вялікага Княства Літоўскага, як ён сам сябе называў, Вялікі Рэдактар Ежы Гедройц належыць розным культурам, бо ўвасобіў і развіваў польскую, беларускую, украінскую і літоўскую духоўную традыцыю.

Яшчэ з 70-х гг. мінулага стагоддзя «Культура» была адной з важнейшых крыніц інфармацыі пра Беларусь у Еўропе: з 1993 да 2000 г. змешчана больш за 80 артыкулаў на беларускую тэматыку, хаця спецыяльнага нумара «Культуры», прысвечанага Беларусі, так і не выйшла. Да 1996 г. пераважалі матэрыялы, якія асвятлялі грамадска-культурнае жыццё ў Беларусі; пазней на першы план выйшлі польская ўсходняя палітыка і незалежнасць Беларусі. Менавіта Ежы Гедройц ці не першы ў Еўропе прапанаваў і паважна разглядаў беларускую суб'ектнасць [2], у якой убачыў магчымасці

развіцця. І гэта ў той час, калі беларуская культура вызначалася як цалкам савецкая − залежная, лакальная, пераходная.

Імя нашага славутага земляка стала шырока ўзгадвацца ў Беларусі толькі з 1998 г., пасля выхаду беларуска-польскага нумару часопіса «Фрагмэнты» і выставы «Культуры». У лютым 2001 г., ужо пасля смерці Ежы Гедройца, у Скарынаўскім цэнтры адбыўся «круглы стол», прысвечаны памяці Вялікага Рэдактара. У 2006 г. былі перавыдадзеныя матэрыялы гэтага «круглага стала» і арганізаваная чарговая міжнародная канферэнцыя, прысвечаная асобе Ежы Гедройца і беларуска-польскім культурным стасункам.

Сама прысутнасць беларускай праблематыкі на старонках «Культуры», часта дэманстратыўна пагарджанай, мяняла многае. «Без незалежных Украіны, Літвы і Беларусі немагчыма ўявіць сабе незалежнасці Польшчы. Без польскае падтрымкі нічога не выйдзе з беларускіх спробаў узбіцца на незалежнасць», — гучала са старонак «Культуры».

Беларусь наўрад ці мела большага абаронцу свайго права на самавызначэнне, на магчымасць належаць да еўрапейскай сям'і народаў, чым Ежы Гедройц і яго часопіс «Культура». Сваю літаратурную і выдавецкую дзейнасць Е. Гедройц прысвяціў нармалізацыі адносін Польшчы з Літвой, Беларуссю, Украінай. Сапраўдны дыпламат і палітык, ён імкнуўся да кампрамісу і шукаў дыялогу, думаў пра палітыку ў катэгорыях маральнасці, выступаў супраць кланавасці, асабістай карысці, коснасці, правінцыйнасці ў палітыцы.

У 1994 г. ў кнізе «Аўтабіяграфія на чатыры рукі» Е. Гедройц пісаў: «...Мы павінны праводзіць незалежную палітыку, а не быць кліентамі Злучаных Штатаў ці якой-небудзь іншай дзяржавы. Нашай галоўнай мэтай павінна быць нармалізацыя польска-расійскіх і польска-нямецкіх адносін, з адначасовай абаронай незалежнасці Украіны, Беларусі і прабалтыйскіх краін і пры цесным супрацоўніцтве з імі. Мы павінны сабе ўсвядоміць, што чым мацнейшай будзе наша пазіцыя на Усходзе, тым больш будуць з намі лічыцца ў Заходняй Еўропе» [3].

Не ведаю, ці ўласна гэтай ідэяй кіруюцца арганізатары штогадовага Эканамічнага форума ў Крыніцы Здруй − паўднёвым польскім курортным гарадку, — форума, які адзін з напрамкаў нязменна прысвячае ролі Цэнтральнаеўрапейскага рэгіёну ў стратэгічным развіцці Еўропы. Так, вераснёўскі 2008 г. Эканамічны форум «Еўрапейскія дылемы. Цэнтральная Еўропа: партнёр ці статыст?» (галоўным арганізатарам выступіў варшаўскі Інстытут усходнееўрапейскіх даследаванняў), на які сабралася бізнес- і палітычная эліта, вядомыя грамадскія дзеячы і эксперты еўрапей-

скіх і шэрагу азіяцкіх краін, а таксама ЗША (усяго каля 2000 чалавек), быў прысвечаны пераважна праблеме эканамічнага і гуманітарнага развіцця Цэнтральнай Еўропы ў кантэксце сучасных геапалітычных працэсаў. (Дарэчы, упершыню за апошнія некалькі гадоў Беларусь прадстаўляла ўрадавая дэлегацыя на чале з Віцэ-прэм'ерам А. Кабяковым. Прысутнічаў і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча П. Латушка). На форуме, як і на папярэдніх, зноў падкрэслівалася, што, нягледзячы на сусветныя і рэгіянальныя інтэграцыйныя працэсы і цяжкі шлях нівелявання старых і фарміравання новых каштоўнасцей, усё ж лепшай формы існавання нацыі і нацыянальнай культуры, чым нацыянальная дзяржава, чалавецтва не вынайшла. Не толькі блізкасць культур, гісторыі, ментальнасці народаў Цэнтральнай Еўропы, але і само геапалітычнае становішча, агульнасць інтарэсаў, у тым ліку ў плане захавання ўласнай ідэнтычнасці, вымагаюць яднання і ўзаемападтрымкі краін гэтага рэгіёну. Менавіта агульнасць каштоўнасцей на аснове салідарнасці садзейнічае не маналогу асобных культур, але міжкультурнаму дыялогу і натуральнаму развіццю кожнага народа і разам з тым спрыяе пераходу ад вузка-лакальнага мыслення да мыслення кантынентальнага і глабальнага.

У Беларусі гедройцава ідэя добрасуседства ўвасобілася ў дзейнасці Польскага інстытута ў Мінску, які з цягам часу павялічвае актыўнасць і эфектыўнасць сваёй працы, накіраванай не толькі на папулярызацыю польскай культуры ў Беларусі, здабыткаў польска-беларускага памежжа і польска-беларускай гісторыі, але і на падтрымку ментальна блізкай палякам беларускай культуры (праз розныя праекты). Дарэчы, дзякуючы Польскаму Інстытуту ў Мінску штогод аб'яўляецца конкурс імя Ежы Гедройца на лепшую журналісцкую працу, прысвечаную беларуска-польскім стасункам. Дзейнасць Польскага інстытута ў Мінску шмат у чым абапіраецца на досвед і ідэі Ежы Гедройца. Некалькі дзён таму з радасцю даведалася пра адкрыццё ў Польшчы структуры, па характару дзейнасці блізкай да Польскага інстытута, — Цэнтра беларускай культуры з сядзібай у Беластоку (некалі ў сваю бытнасць дырэктарам Скарынаўскага цэнтра прыклала шмат намаганняў для стварэння падобнага кшталту інстытуцыі).

Ежы Гедройц практычна дапамагаў Беларусі праз падтрымку навукоўцаў, беларускай меншасці ў Польшчы, спрычыніўся да адкрыцця кафедры беларускай культуры ў Беластоцкім універсітэце і г.д. Была заснаваная нават асабістая стыпендыя Е. Гедройца, дзяку-

ючы якой многія беларускія даследчыкі атрымлівалі магчымасць вывучаць польскую культуру і ўвогуле выязджаць у Еўропу.

Асоба Ежы Гедройца як бы ініцыявала шэраг беларускіх навукова-культурных праектаў: менавіта спадчына Вялікага Рэдактара натхніла мяне на правядзенне ў верасні 2000 г. «круглага стала» «Ідэя беларускасці і ідэя польскасці на мяжы тысячагоддзяў: да вызначэння паняццяў» (выйшаў адпаведны зборнік матэрыялаў); у 2001 г. Цэнтр гуманітарных ініцыятыў выступіў з ідэяй стварыць Фонд «Адраджэнне і развіццё беларускіх сядзібаў» дзеля аказання дапамогі нашчадкам уладальнікаў, у тым ліку і прадстаўнікам роду Гедройцаў; буйны праект Магілёўскага таварыства «Брама» — выданне новага незалежнага беларускага квартальніка «Край»; новыя пошукі гісторыкаў, архівістаў, нават у такой форме, як адказ на пытанне: «Што магло паўплываць на фарміраванне светапогляду Ежы Гедройца, які нарадзіўся і пражыў 12 гадоў у Мінску?».

Ежы Гедройц — яркі прадстаўнік шляхты, якая ў XX ст. увасобіла сваё рыцарства ў духоўным узлёце, як калісьці Адам Міцкевіч. Дарэчы, апошні ацэньваў падзеі таксама з пункту гледжання маральных крытэрыяў. Адсюль — ідэалы зямнога раю ў «Пане Тадэвушу», вобразы раю і пекла ў «Дзядах» і г.д. Гедройц — рамантык XX ст., які працягваў традыцыі Адама Міцкевіча. Нарадзіўшыся ў Беларусі, абодва пазбеглі нацыянальнай аднабаковасці, чаму паспрыяў таксама сінтэз маральных ідэалаў Беларусі і Польшчы. Асаблівая ж акцэнтацыя маральных каштоўнасцей у значнай меры ўласціва менавіта Беларусі.

І яшчэ адну постаць хацелася б узгадаць − Браніслава Герэмека (1932−2008), дэпутата Еўрапарламента, колішняга міністра замежных спраў Польшчы, якому гэтаксама ўласцівая талерантнасць і маральнасць у адданасці справе. Можа, таму, што асабіста дастаткова добра ведала польскага палітыка і дыпламата Браніслава Герэмека і з болем успрыняла вестку аб яго раптоўнай смерці, мне асабліва прыйшлася даспадобы вечарына яго памяці пад назвай «Палітыка − гэта таксама пытанне густу. Чалавек, Культура, Гісторыя» (або «Ніхто Прафесара не заменіць»), якая адбылася ў той жа Крыніцы Здруй у верасні гэтага года. Дзяліліся ўспамінамі ў той вечар Лех Валенса, Уладзіслаў Барташэўскі, Леапольд Унгер, Барыс Тарасюк, Вітаўтас Ландсбергіс і іншыя вядомы асобы. А мне хацелася ўспомніць майскі 2008 г. Еўрапейскі тыдзень на нямецка-французскім памежжы — федэральнай зямлі Саар, дзе Браніслаў Герэмек у чарговы раз прадэманстраваў свой — па-польску непаўторны — непераўзыдзены дэмакратызм, сваё дасканалае веданне беларускай сітуацыі і сімпатыю, прыхільнасць да нас, бела-

русаў. Сапраўды, як трапна заўважыў польска-бельгійскі публіцыст Леапольд Унгер, «са смерцю Браніслава Герэмека Польшча страціла вялікага паляка, Еўропа — вялікага еўрапейца, культура — захопленага інтэлігента, навука — выбітнага гісторыка, многія сябры з усіх краін свету — унікальнага, цёплага, лаяльнага чалавека, на якога можна было заўсёды спадзявацца».

Калі чалавек высокага духу і адданага самаслужэння радзіме і праўдзе становіцца маральным аўтарытэтам у грамадстве — такое грамадства мае добрыя перспектывы. Здзіўляючы нашчадкаў сваёй здольнасцю глядзець наперад, прадугадваць будучыню, поруч з ідэямі Ежы Гедройц пакінуў нам узор незалежнасці духу, сілы выказваць непапулярныя думкі. Валодаючы смеласцю ў ацэнках з'яў і падзей, Ежы Гедройц не цярпеў ксенафобіі, не дзяліў людзей на «нашых» і «вашых». Адкрытасць, пошук праўды, свабодалюбства, годнасць — наш зямляк увасобіў у сабе гэтыя лепшыя якасці польскага характару, якасці, якія калісьці ў поўнай меры мелі і беларусы...

Ежы Гедройц, які жыў за межамі Бацькаўшчыны, усё свядомае жыццё аддаў прапагандзе славянскай культуры ў Еўропе. Таму асоба і дзейнасць Ежы Гедройца з'яўляецца прыкладам, парадыгмай служэння культуры, чалавецтву, дабру.

**Літаратура**

1. Жыццяпіс выдатнага гуманіста: прадмова // Ежы Гедройц і Беларусь: матэрыялы Міжнароднага «круглага стала» (Мінск, ННАЦ імя Ф. Скарыны, 2001). Мінск: Беларускі кнігазбор, 2006. С. 4.

2. Бабкоў, І. Ежы Гедройц і посткаланіяльнае мысленне // Там жа. С. 21.

3. Год Ежы Гедройца. 2006. Мінск: ІР і інш., 2006. С. 15.

# Состояние белорусско-польского политического диалога в 2008 г.

***Александр Тихомиров**, кандидат исторических наук, доцент*

Победа на досрочных парламентских выборах в Польше в октябре 2007 г. партии «Гражданская платформа» и формирование нового правительственного кабинета во главе с лидером партии Д. Туском не привели к оживлению диалога между официальными структурами в Варшаве и Минске. Польская сторона считала, что активизация контактов в политической сфере сможет осуществиться лишь после восстановления в Беларуси демократических стандартов. В мае 2008 г. министр иностранных дел Польши Р. Сикорский, выступая перед депутатами Сейма с речью об основных направлениях польской внешней политики, заявил: «Беларусь может рассчитывать на польскую поддержку повсюду там, где сделает ставку на уважение к правам человека и политическим правам оппозиции, на диалог, компромисс и открытость по отношению к Европе» [1].

Однако такая установка была абсолютно неприемлемой для белорусского руководства, поскольку расценивалась как вмешательство во внутренние дела белорусского государства.

Понимания в Минске не вызвало и введение в действие законодательства о «карте поляка», осуществленное польским правительством в начале 2008 г. 7 февраля 2008 г. пресс-секретарь МИД Республики Беларусь А. Попов заявил, что польская сторона не провела консультаций по этому поводу с соседними государствами и введение закона в действие может вызвать напряженность в белорусском обществе, нарушить его стабильность и породить недоверия между белорусскими гражданами различных национальностей [2]. 2 апреля 2008 г. пресс-секретарь белорусского МИД вернулся к теме «карты поляка», обратив внимание на то, что в условиях явного нежелания польской стороны осуществлять конструктивный диалог по соответствующей проблеме белорусская сторона оставляет за собой право принять меры по противодействию выдаче соответствующих документов в Беларуси [3].

В центре внимания белорусских и польских дипломатов находились вопросы совершенствования режима пересечения белорус-